# СПЕЦЫФІКА ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У ПРОЗЕ ІВАНА ШАМЯКІНА 1990-Х ГГ.

**І. І. Шматкова**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220050, Мінск, Беларусь, i.shmatkova@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца жаночыя вобразы ў аповесцях народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна, якія былі напісаны ім у 1990-х гг. XX ст. Аўтар артыкула даказвае, што Іван Шамякін стварыў багатую галерэю жаночых вобразаў, ідэальным сярод якіх становіцца талстоўская гераіня: жанчына як сімвал кахання, сям’і, жыцця. Ва ўмовах голаду, нястачы, стратаў, хвароб яго гераіні выяўляюць моцны характар, традыцыйна ўласцівы беларускім жанчынам.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчасць; проза; аповесць; аўтабіграфічная аповесць; жаночыя вобразы.

Проза Івана Шамякіна – адна з багацейшых з’яў беларускай літаратуры XX ст., прыклад шматгадовай нястомнай працы. І. П. Шамякін – сапраўдны беларускі Талстой, які ў сваіх творах даследаваў сучаснае яму жыццё, людзей, лёс чалавека, яго псіхалогію. І таксама, як і яго ўлюблёны рускі класік Леў Мікалаевіч, асаблівую ўвагу надзяляў паказу ролі кахання, сям’і, дзяцей у жыцці чалавека, і асабліва ў лёсе жанчыны.

У аўтабіяграфічнай аповесці «Слаўся, Марыя!», якую ён сам вызначыў як «гісторыю кахання, любові, жыцця», прысвечанай яго жонцы Марыі Філатаўне, аўтар зазначае, успамінаючы гісторыю напісання многіх твораў, напрыклад «Гандляркі і паэта»: «Лёс жанчыны – во аснова» [2, с. 1438]. Эпіграфам да гэтага твора І. Шамякін нездарма абірае словы Л. Талстога: «Каханне – даброта, быць каханым – шчасце. Якое дзіўнае і трапнае слова, што

муж і жонка (калі яны жывуць духоўна) не двое, а адзіная істота» [2, с. 1400]. Дарэчы, у згаданай аповесці аўтар неаднаразова звяртаецца да радкоў рускага пісьменніка: «У старасці адміраюць здольнасці, знешнія якасці, якімі ўступаем у зносіны са светам: зрок, слых, смак, але затое нараджаюцца новыя, не знешнія, а ўнутраныя пачуцці для зносін з духоўным светам, – і ўзнагарода з вялікім лішкам. Я адчуваю гэта. І цешуся, дзякую і цешуся» [2, с. 1416], нібы яшчэ раз упэўніваючыся ў правільнасці абраных некалі прыярытэтаў. І. Шамякін салідарызуецца з Л. Талстым і ў любові да людзей: «Бязлітасны быў да сябе Талстой і запісваў у дзённік: «Дзіўная рэч: я ведаю пра сябе, які я дрэнны і дурны, а між іншым мяне лічаць геніяльным чалавекам. Якія ж астатнія людзі?» А ён любіў гэтых людзей. І я люблю…» [2, с. 1417], і ў ролі памяці: «І зноў жа, Талстой, разгарнуў учора там і прачытаў: “…усё-такі аснова і розуму і ўсяго духоўнага жыцця ёсць здольнасць успамінаў”» [2, с. 1400]. Памяць І. Шамякін ідэалізуе, узвышае, нават матэрыялізуе. Узгадваючы гісторыю з фільма «Камандор і Ганна», аўтар параўноўвае яе са сваёй, жыццёвай: «Калі з двух людзей, што кахаюць адзін аднаго, жывы застаецца адзін, гісторыя іх жыцця, іх кахання прадаўжаецца. Гэта праўда. Гісторыя нашага з Машай кахання, любові, жыцця прадаўжаецца, пакуль я хаджу па зямлі і магу трымаць у руцэ пяро» [2, с. 1401].

Як і Л. Талстой, І. Шамякін стварыў шырокую галерэю жаночых вобразаў у шматлікіх гісторыях кахання і жыцця, у якіх, як вядома, «усе шчаслівыя сем’і шчаслівыя аднолькава, кожная нешчаслівая сям’я нешчаслівая па-свойму». І большасць яркіх, запамінальных характараў беларускіх жанчын І. Шамякін «спісаў» з вобраза сваёй любімай жонкі Марыі Філатаўны, з якой пражыў разам да яе смерці 58 гадоў. І. Шамякін лічыць, што менавіта жонка дапамагала яму тварыць: «Каханне наша дапамагло мне стаць пісьменнікам» [2, с. 1409]; менавіта жонка дапамагла яму выжыць: «Яна асцерагала мяне больш за паўстагоддзя! Ад злых людзей, ад хвароб, ад літаратурнай багемы, ад захаплення славай і ад markрознага глупства» [2, с. 1422].

Марыя Філатаўна, як успамінае сам аўтар у «Слаўся, Марыя!», стала прататыпам Сашы Траянавай з

«Трывожнага шчасця» (асабліва аповесцей «Непаўторная вясна» і «Мост»), Таццяны Маеўскай з «Глыбокай плыні», фельчаркі Тасі Батрак з рамана «Вазьму твой боль», Полі з «Атлантаў і карыятыдаў»; асобныя рысы жонкі аўтар увасобіў у вобразах Вольгі Ляновіч з «Гандляркі і паэта», Надзеі са «Снежных зім», Галіны Адамаўны, жонкі доктара Яраша, з рамана «Сэрца на далоні» і інш. Праўда, стварэнню не ўсіх жаночых вобразаў спрыяла жонка, так І. Шамякін успамінаў: «Пра воінаў-дзяўчат хацелася напісаць даўно, але, прызнаюся шчыра, баяўся Машынай… не тое што рэўнасці, пэўнага незадавальнення, а ёй жа перадрукоўваць вялікі раман. Баяўся дарэмна: “Зеніт” яна ацаніла так жа высока, як і “Сэрца на далоні”, “Атланты…”, “Гандлярку”…» [2, с. 1415].

Магчыма, па гэтай прычыне агульнасці прататыпа многія жаночыя вобразы ў І. Шамякіна ў нечым падобныя. Як зазначае літаратуразнаўца В. Локун, «у сваіх поглядах на жанчын і іх ролю ў грамадстве пісьменнік застаецца абсалютным “талстоўцам”. Сацыяльныя функцыі жанчыны ён часцей за ўсё абмяжоўваў сям’ёй і мацярынствам. У гэтых адносінах ён досыць красамоўна выказаўся ў рамане «Петраград – Брэст» вуснамі героя твора, які хацеў бачыць у асобе жанчыны «толькі жанчыну, створаную для кахання, для шчасця, для дзяцей» [1, с. 623].

Але ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. рэзкія змены ў грамадскім жыцці выклікалі змены ў светапоглядзе многіх пісьменнікаў. У прыватнасці, І. Шамякін у аповесці «Драма» (1988) стварае вобраз жанчыны-функцыянера, партыйнага кіраўніка Алы Наліцкай, драму якой аўтар бачыць у канфлікце паміж грамадскімі абавязкамі і адвечна жаночым – каханнем і мацярынствам, паміж «афіцыйнай асобай» і «звычайнай бабай» [2, с. 773]. Напэўна, у свеце сённяшніх гендарных поглядаў такая аўтарская пазіцыя ў дачыненні да ролі жанчыны ў грамадстве можа аказацца спрэчнай. «Дзіўна для яе: быццам людзі толькі гэтым і жывуць – каханнем, жаніцьбай, замуствам, узаемаадносінамі палоў. Яе гэта цікавіць толькі ў плане работы – клопатаў пра загсы, радзільныя дамы, яслі, сады» [2, с. 751], – такое адмаўленне асабістага жыцця гераіняй – прыкмета таго

часу, калі рушыліся старыя ўстоі, а з новымі, якія прыйшлі з захаду, жыхары савецкага грамадства не ведалі, што рабіць. Ну калі яшчэ немагчымасць сумяшчэння кар'еры і асабістага жыцця можна назваць прыкметай савецкага часу, то вызначэнне ўзросту 36-гадовай «адзінокай старэючай жанчыны» гучыць зусім па-талстоўску.

Увогуле, у 1990-я гг. у І. Шамякіна як пісьменніка сацыялістычнага светапогляду крах ідэй, якімі жыла краіна 70 год, выклікаў роспач. У новых умовах аўтар, здавалася, расчараваўся ў духоўным стане грамадства, страціў свой сацыяльны аптымізм, які быў уласцівы яго творам савецкага часу. Але адначасова гэтыя змены выклікалі творчы ўздым пісьменніка: адна за другой выходзяць аповесці І. Шамякіна: «Ахвяры» (1990), «Paradies auf Erden» (1993), «Вернісаж. Аповесці Івана Андрэевіча» (1993), «Сатанінскі тур» (1993), «Падзенне» (1994), «Адна на падмостках» (1994), «Бумеранг» (1995), «Без пакаяння» (1995), «Палеская мадонна» (1996), «Выкармак» (1996), «Крывінка» (1997), «Зона павышанай радыяцыі» (1997), «Слаўся, Марыя!» (1998), «Завіхрэнне» (1998); у гэты час І. Шамякін напісаў тры раманы: «Злая зорка» (1991), «Вялікая княгіня» (1995), «Губернатар» (2000). Большасць з гэтых твораў прывечана праблемам сучаснага для аўтара жыцця, пісьменнік выкрывае шматлікія заганы грамадства, якія агаліла дэмакратыя. І нядзіўна, што сярод жаночых вобразаў з твораў гэтага часу І. Шамякін не называе ніводнага, для каго прататыпам стала яго жонка. Жанчыны тут становяцца сведкамі і ахвярамі жыццёвых трагедый. Такія ў «Вернісажы» вобразы жонкі мастака Міхала Рачыцкага Веры і жонкі пісьменніка Івана Андрэевіча Вольгі. Даведзеныя да крайняй напружанасці жыцця, не бачачы выхаду з жыццёвага разладу, і муж, і жонка па асабістым жаданні сыходзяць жыцця. Вобраз Веры пісьменнік стварае як вобраз вернай спадарожніцы мужа да канца яго жыцця: «Веры няма… Выканала свой апошні зямны абавязак, села ў крэсла і … адышла следам за сваім неспакойным спадарожнікам. Ці дагнала яго на на той вечнай дарозе, на якой няма павароту?» [2, с. 991].

Не бачыць выхаду з жыццёвага тупіка і галоўная гераіня аповесці «Адна на падмостках» Аляксандра

Паўлаўна Астройка, былая актрыса, народная артыстка рэспублікі: «Апусціла рукі <…> і ўміг пастарэла, горш таго – аслабла ад бездапаможнасці, ад няведання, навошта яе пакуты… пад канец жыцця» [2, с. 1005]. Унутраная драма гераіні накладваецца на сацыяльную драму жыцця, выхад з якой – уключаная незапаленая газавая пліта.

У аповесці «Сатанінскі тур», якую адносяць да літаратуры абсурду, усе героі – «вобразы-сілуэты пэўных ідэй» [1, с. 627], у тым ліку жанчыны. Так, Уладзіслаў звяртаецца да сваёй жонкі Марыны, якая збірае яго ў дарогу: «Якая ты правільная ў мяне. Такія могуць жыць толькі пры камунізме» [2, с. 914]. У гэтым творы выхад аўтар намячае праз веру, перад пахаваннем мужа Марына паўтарае: «Ёсць нейкая сіла, Іваначка, ёсць Бог…» [2, с. 950], а Тася, адна з удзельніц злашчаснага падарожжа, перажывае катарсіс праз пакаянне: «Мы нелюдзі! Мы! Судзіце нас, людзі! Ён памёр перад Брэстам. І мы не павярнулі назад. Долары нам даражэй былі. Розум яны нам зацьмілі. Пакарай нас, Божа! Пакарайце, люді! <…> Я ў манастыр пайду <…> Я дзве ночы сню Багародзіцу. Яна кліча мяне…» [2, с. 950]. Такім чынам, І. Шамякін у сваіх творах прыходзіць да ўсведамлення хрысціянскіх матываў як шляху да маральнай дасканаласці чалавека, як крыніцы аптымізму і надзеі ў складаны час выпрабаванняў.

У гістарычным рамане «Вялікая княгіня» І. Шамякін спрабуе знайсці сваю «эстэтычную мадэль духоўнасці» [1, с. 629]. Галоўная гераіня рамана Алена, дачка маскоўскага князя Івана Васільевіча, на мяжы XV і XVI стст. «бралася шлюбам» з князем Вялікага Княства Літоўскага Аляксандрам. Вобраз князёўны Алены велічны і трагічны адначасова, яе аддаюць замуж па дамоўленасці за непрыемнага ёй, старэйшага на 15 гадоў князя, адпраўляюць у рызыкоўную дарогу… «Але ўсё гэта – мірскія дробязі. Думаць трэба не пра гэта – пра душу» [2, с. 648], – упэўнена Алена. Вялікая княгіня Алена – прыклад высокай духоўнасці і цвёрдасці характару.

Больш неадназначным і праблемным атрымаўся ў І. Шамякіна вобраз Надзеі Русак з «Палескай мадонны». Аповесць была не вельмі высока ацэнена крытыкай, якая чакала ад твора з такой абагульненай высокай назвай

ідэальны вобраз беларускі – жанчыны, жонкі, маці. Але сучасная беларуская мадонна сутыкаецца з праблемамі кшталту «чым накарміць дзяцей», і вобраз страчвае сваю бездакорнасць.

Такім чынам, І. Шамякін стварае багатую галерэю жаночых вобразаў, ідэальным сярод якіх становіцца талстоўская гераіня – жанчына – сімвал кахання, сям'і, дзяцей, жыцця. Але ў творах пісьменнік сваіх гераінь часта змяшчае ў ненатуральныя для іх стану ўмовы (голад, нястача, страты, хвароба, старасць і г. д., як у ваенны, так і ў мірны час), што ніяк не можа, на думку аўтара, стасавацца са слабым полам, але гераіні, насуперак сваёй гендарнай прадвызначанасці, выяўляюць моцны характар, уласцівы беларускім жанчынам.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Локун В. І. Іван Шамякін. // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. Мінск: Беларус. навука, 2001. Т. 3: 1941 – 1965. С. 597 – 639.
2. Шамякін І. П. Збор твораў (1981 – 2001). Мінск: Бібліятэка саюза пісьменнікаў Беларусі, 2009.


## РЕЧЕВОЙ ПОРТРЕТ ПЕРСОНАЖА В РОМАНЕ И. ШАМЯКИНА «ГЛЫБОКАЯ ПЛЫНЬ» И ПОВЕСТИ «ГАНДЛЯРКА І ПАЭТ»


**Е. П. Синяк**

*Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь, пр. Машерова, 6, 220005, Минск, Беларусь,* sinyak.elenka@mail.ru